**УДК 069.01**

# ВЫВУЧЭННЕ І АКТУАЛІЗАЦЫЯ НЕМАТЭРЫЯЛЬНАЙ КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ НАЦЯНАЛЬНЫМ ПОЛАЦКІМ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫМ МУЗЕЕМ-ЗАПАВЕДНІКАМ У 1991–2016 гг.

***Д.У. ФІЛІПЧЫК***
***(Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск)***

*Даследуецца выкарыстанне ў экспазіцыйна-выставачнай і культурна-адукацыйнай дзейнасці Нацянальным Полацкім гісторыка-культурным музеем-запаведнікам элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны ў 1991–2016 гг. Прыведзены галоўныя накірункі навукова-даследчай работы музея-запаведніка, звязаныя з нематэрыяльнай спадчынай. Даследаванне ўтрымлівае звесткі і прыклады формаў культурна-адукацыйнай дзейнасці музея, у якіх выкарыстоўваюцца элементы нематэрыяльнай культурнай спадчыны і якія спрыяюць захаванню і папулярызацыі гэтай спадчыны (экскурсіі, лекцыі, музейна-педагагічныя заняткі, майстар-класы, музейныя святы і тэматычныя праграмы-анімацыі). Паказана роля Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка ў актуалізацыі нематэрыяльнай спадчыны і яе захаванні.*

***Ключавыя словы****: нематэрыяльная культурная спадчына, Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік, культурна-адукацыйная дзейнасць музея, Музей традыцыйнага ручнога ткацтва Паазер'я, захаванне спадчыны.*

**Уводзіны.** Захаванне гісторыка-культурнай спадчыны з'яўляецца важнай і прыярытэтнай задачай дзяржавы і ўсяго беларускага грамадства. Неабходна захаваць не толькі матэрыяльныя праяўленні культуры (музейныя прадметы, помнікі археалогіі, архітэктуры і гарадскую забудову), але і спадчыну нематэрыяльную (звычаі, абрады, вусную народную творчасць, тэхналогіі і г.д.). З кожным годам, у тым ліку і ў нашай краіне, у справу вывучэння і захавання нематэрыяльнай культурнай спадчыны (далей – НКС) усё больш актыўна ўключаюцца музейныя ўстановы. Музеі займаюцца не толькі вывучэннем НКС, але і спрыяюць яе захаванню праз актуалізацыю гэтай спадчыны. Пад актуалізацыяй НКС будзем разумець выкарыстанне элементаў нематэрыяльнай спадчыны музеем у экспазіцыйна-выставачнай і культурна-адукацыйнай дзейнасці, па сродках чаго элементы НКС становяцца запатрабаванымі сучасным грамадствам.

Асаблівую ролю ў вывучэнні і актуалізацыі НКС адыгрываюць музеі-запаведнікі. Комплексны профіль музея дазваляе ажыццяўляць рознабаковую дзейнасць, скіраваную на вывучэнне, захаванне і папулярызацыю гісторыка-культурнай спадчыны, у тым ліку і НКС. Дадзеныя ўстановы могуць выкарыстоўваць музейныя прадметы, навукова-дапаможныя і сыравінныя матэрыялы ў мэтах "падтрымкі і развіцця народных мастацкіх рамёстваў, папулярызацыі і распаўсюджвання вырабаў народных мастацкіх рамёстваў, гістарычных традыцыйных тэхналагічных працэсаў гаспадарання, вытворчасці, прыгатавання асобных відаў прадуктаў харчавання нацыянальнай кухні" [1, с. 143]. Безумоўна, пры ўмове, што такая дзейнасць не стварае пагрозы захаванню музейных прадметаў, іх пашкоджання або страты.

У Рэспубліцы Беларусь на сённяшні дзень існуе тры музеі-запаведнікі. Гэта Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік (далей – НПГКМЗ), Гісторыка-культурны музей-запаведнік "Заслаўе" і Нацыянальны гісторыка-культурны музей-запаведнік "Нясвіж". Ніжэй разгледзім дзейнасць НПГКМЗ па вывучэнні і актуалізацыі НКС у 1991–2016 гг.

На базе Полацкага краязнаўчага музея, які быў заснаваны ў 1926 г., у 1967 г. быў створаны гісторыка-археалагічны запаведнік. У 1990 г. ён быў перайменаваны ў гісторыка-культурны запаведнік, а з 1997 г. – у Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік. 26 ліпеня 2000 г. музей атрымаў статус нацыянальнага [2, с. 9]. Як адзначыла дырэктар музея-запаведніка Т. А. Джумантаева, у 1985–2012 гг. музей-запаведнік пабудаваў трывалую структуру, якая адпавядае сучасным патрэбам музейнай інтэграцыі [3, с. 386]. На 2016 г. НПГКМЗ у сваёй структуры ўтрымлівае 11 музеяў (Краязнаўчы музей, Музей баявой славы, Музей-кватэра Героя Савецкага Саюза З.М. Тусналобавай-Марчанка, Музей гісторыі архітэктуры Сафійскага сабора, Музей беларускага кнігадрукавання, Музей-бібліятэка Сімяона Полацкага, Музей традыцыйнага ручнога ткацтва Паазер'я, Стацыянарная выстава "Прагулка па Ніжне-Пакроўскай", Мастацкая галерэя, Дзіцячы музей, Прыродна-экалагічны музей) і 65 аб'ектаў, унесеных у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь, што патрабуе ад яго шматвектарнай дзейнасці [4, с. 80]. У чатырох з адзінаццаці філіялаў музея-запаведніка найбольш актыўна вядзецца праца з рознымі элементамі НКС. Гэта Краязнаўчы музей, Музей традыцыйнага ручнога ткацтва Паазер'я, Дзіцячы музей і Прыродна экалагічны музей.

**Вывучэнне нематэрыяльнай культурнай спадчыны.** Для максімальна эфектыўнага і навукова абгрунтаванага выкарыстання элементаў НКС у экспазіцыйна-выставачнай і культурна-адукацыйнай дзейнасці музею неабходна займацца вывучэннем і сістэматэзацыяй гэтай спадчыны. Навукова-даследчая работа НПГКМЗ рэгламентуецца Палажэннем аб навукова-даследчай рабоце, якое было зацверджана дырэктарам музея-запаведніка. Згодна з ім адной з асноўных задач НПГКМЗ з'яўляецца "навукова даследчая дзейнасць у галіне беларускай гісторыі і культуры", а сярод 18 накірункаў даследчай работы адзначаны накірунак "этнаграфія" [5, л. 1], які найбольш цесна звязаны з НКС.

Улічваючы музейную спецыфіку, як правіла, музейныя спецыялісты займаюцца вывучэннем не самой нематэрыяльнай спадчыны, а артэфактаў, што з гэтай спадчынай звязаныя. Але ў той жа час музеі арганізуюць гісторыка-этнаграфічныя экспедыцыі для выяўлення прадметаў музейнага значэння, падчас якіх фіксуюцца і элементы НКС. У разглядаемы перыяд экспедыцыйная дзейнасць НПГКМЗ не насіла шырокага характару. Былі арганізаваны тры працяглыя экспедыцыі па вывучэнні этнаграфічнай спадчыны Віцебскай вобласці (Пастаўскі, Полацкі, Верхнядзвінскі раёны). Першая экспедыцыя праходзіла ў Пастаўскім раёне з 12 па 18 ліпеня 1991 г. Мэтай даследчыкаў быў "працяг камплектавання калекцый, якія характарызуюць развіццё рамёстваў і промыслаў, сялянскага побыту" [6, л. 2]. Падчас экспедыцыі было абследавана 10 вёсак Камайскага і Палескага сельсаветаў і сабрана 72 прадметы (ручнікі, дываны, мэбля, кераміка, плеценыя вырабы, прылады працы, узоры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і інш.) [7, л. 4]. Адметна тое, што экспедыцыя выявіла бытаванне гарбарнага рамяства ў в. Камаі. Майстар Лебедзь Мустафа Амуратавіч не толькі перадаў музейным супрацоўнікам прылады апрацоўкі скуры, але і пазнаёміў з тэхналогіяй іх апрацоўкі ў хатніх умовах, якая была падрабязна апісана і зафіксавана спецыялістамі [6, л. 3]. Экспедыцыя выявіла валоданне жыхарамі в. Палессе закладной тэхнікай ткацтва, а сярод вяскоўцаў у Свіранах – носьбіта выканальніцкага мастацтва народных песень.

З 7 па 12 жніўня 1991 г. супрацоўнікі НПГКМЗ арганізавалі экспедыцыю з мэтай вывучэння этнаграфічнай спадчыны Полацкага раёна. Былі абследаваны в. Астроўна і в. Жаўнова, зроблены падворны абыход 50 дамоў і сабрана 40 экспанатаў [8, л. 3]. У адрозненні ад папярэдняй накірункі збору матэрыяла гэтай экспедыцыі былі больш разнастайнымі: археалогія, народная архітэктура, сялянскі побыт, рамёствы і промыслы, фальклор [8, л. 2]. Зафіксаваны імёны і біяграфічныя звесткі майстроў (цесляры, бондары, рымары), выканальніц народных песень. Запісаны ўзоры народных песень, замоў, прыказак і прымавак, прыкмет, асаблівасці культуры харчавання і інш.

Апошняя за разглядаемы перыяд экспедыцыя праходзіла з 23 па 26 ліпеня 1993 г. у Верхнядзвінскім раёне. У выніку былі зафіксаваны этнаграфічныя звесткі аб развіцці рамёстваў рэгіёну і набыта 23 прадметы (ручнікі, дываны, карункі, прылады працы і інш.) [9, л. 4].

Іншы накірунак вывучэння НКС у музеі – гэта вывучэнне этнаграфічных калекцый. Паводле Канвенцыі 2003 г., да НКС адносяцца "звычаі, формы прадстаўлення і выражэння, веды і навыкі, а таксама звязаныя з імі інструменты, прадметы, артэфакты і культурныя прасторы, якія прызнаюцца супольнасцямі, групамі і, у некаторых выпадках, асобнымі людзьмі ў якасці часткі іх культурнай спадчыны" [10]. Дадзеныя інструменты, прадметы і артэфакты галоўным чынам згрупаваны ў этнаграфічныя калекцыі.

У НПГКМЗ у разглядаемы перыяд вывучэннем калекцый этнаграфіі і ўласна традыцыйнай культурай займаліся сістэматычна. У 1991 г. у зборніку тэзісаў дакладаў навуковых супрацоўнікаў НПГКМЗ па выніках навукова-даследчай працы былі апублікаваны два артыкулы. прысвечаныя вывучэнню НКС Віцебскай вобласці на падставе музейных калекцый. Гэта артыкулы "Ганчарства Віцебшчыны І пал. ХХ ст." [11] і "Народнае ткацтва Віцебшчыны (савецкі перыяд)" [12, с. 9].

Публікацыі 1993 г. сведчаць аб тым, што цікавасць з боку музейных супрацоўнікаў да вывучэння традыцыйнай культуры не толькі захоўваецца, але і ўзрастае, паколькі колькасць артыкулаў, прысвечаных гэтай тэматыцы, павялічваецца. Па-ранейшаму вядзецца праца па вывучэнні і сістэматэзацыі існуючых калекцый. Аб гэтым сведчаць артыкулы "Вырабы з саломы і лазы ў фондах ПГКЗ" [13] і "Калекцыя беларускай народнай керамікі ў фондах ПГКЗ. Каталог. Гістарыяграфія і бібліяграфія пытання" [14]. У той жа час супрацоўніцай НПГКМЗ Ж.У. Пасадскай вядзецца работа па вывучэнні народнага мастацтва г. Полацка і прылягаючых да яго вёсак ("Архітэктурны дэкор традыцыйнага дома – крыніца вывучэння народнай мастацкай традыцыі" [15]), семантыкі традыцыйнага дэкору пабудоў ("Адлюстраванне паганскага светапогляду ў арнаментальных кампазіцыях дэкора традыцыйных дамоў Полацка і яго наваколля" [16]).

У 1995 г. з'яўляюцца публікацыі, прысвечаныя беларускай народнай кераміцы [17, с. 25], у 1997 г. – вырабам з лазы і саломы. Адзначаецца, што дадзеныя калекцыі папаўняліся ў выніку збіральніцкай працы, навуковых экспедыцый, закупкі ў арганізацый і прыватных асоб [18, с. 80].

У 1998 г. надрукаваны артыкул Н.В. Філатавай, у якім аўтар намагаецца паказаць, што з дапамогай экспазіцыі Музея традыцыйнага ручнога ткацтва Паазер'я магчыма раскрыць тэму язычніцкай міфалогіі [19].

Зборнік Матэрыялаў навукова-практычнай канферэнцыі (па выніках навукова-даследчай работы НПГКМЗ) за 1999 г. утрымлівае артыкулы, прысвечаныя калекцыі вырабаў з саломы і лазы, а таксама комплексу традыцыйнага касцюма. У 2000 г. у выніку далейшай распрацоўкі тэмы з’яўляецца ўступны артыкул да каталогу вырабаў з саломы і лазы, дзе змешчана інфармацыя аб гісторыі камплектавання калекцыі, геаграфіі паходжання вырабаў, развіцці салома- і лозапляцення ў рэгіёне [20]. У гэтым жа годзе з’яўляецца падобная публікацыя Н. В. Філатавай, але прысвечаная калекцыі ручнікоў [21].

На пачатку XXI ст. на старонках выданняў НПГКМЗ з’яўляюцца навуковыя артыкулы, прысвечаныя традыцыйнаму касцюму Паазер’я [22], яго абрадаваму прызначэнню [23], упрыгожванням транспартных сродкаў [14], ручнікам [24], абрусам [25].

У Полацкім музейным штогодніку за 2013 г. з’яўляецца публікацыя старшага навуковага супрацоўніка Музея традыцыйнага ручнога ткацтва Паазер’я Г. А. Шарох “Элементы традыцыйнага вяселля на Падзвінні ў вясельным абрадзе Музея ткацтва «Як зліліся дзве рэчанькі...»” [26], прысвечаная выкарыстанню элементаў НКС у культурна-адукацыйнай дзейнасці музея. У гэтым жа зборніку апублікаваны артыкул Н. В. Філатавай, у якім разгледжаны мастацка-тэхналагічныя асаблівасці ўзорнага ткацтва ручнікоў з музейнага збору НПГКМЗ [27].

**Актуалізацыя нематэрыяльнай культурнай спадчыны.** Найбольш актыўна інтэрпрэтацыяй і захаваннем НКС сярод музеяў гісторыка-культурнага запаведніка займаецца ***Музей традыцыйнага ручнога ткацтва Паазер’я.*** Ён быў адчынены ў снежні 1998 г. Навуковая канцэпцыя музея распрацавана Н.В. Філатавай. У музеі на 2015 г. экспануецца 404 музейныя прадметы [2, с. 193].

Паводле навуковай канцэпцыі музей распавядае аб традыцыях ручнога ткацтва Беларускага Паазер’я, геаграфічна ахопліваючы тэрыторыю сучасных Верхнядзвінскага, Глыбоцкага, Докшыцкага, Міёрскага, Пастаўскага, Полацкага і Шаркаўшчынскага раёнаў Віцебскай вобласці. Задача музейнай экспазіцыі – раскрыць працэс стварэння тканых вырабаў к. XIX – пач. XX стст. У музеі “логіка развіцця ткацтва прадстаўляецца ў выглядзе жывога працэса, які працякае ў форме дыялога паміж прыродай і культурай, дзе нітка, выходзячы з прыроднай стыхіі, імкнецца да ўстойлівай, арганізаванай прасторы – тканіны” [28, с. 35].

Увесь працэс стварэння тканіны разглядаецца ў якасці рытуалу. Гэты працэс адлюстраваны ў трох экспазіцыйных залах: “Вырошчванне і апрацоўка лёну”, “Тэхнікі і віды ткацтва”, “Арнаментыка і семантыка ткацтва” [2, с. 189]. Першая зала знаёміць з гадавым цыклам апрацоўкі лёну, які падзелены на чатыры сезоны (вясна, лета, восень, зіма). У экспазіцыі прадстаўлены прылады працы, характэрныя для кожнага з сезонаў, лён (на розных стадыях апрацоўкі), фотаматэрыялы і г.д. Паказваючы асноўныя этапы апрацоўкі лёну, стваральнікі экспазіцыі прыводзяць прыказкі і прыкметы, звязаныя з гэтымі этапамі. Візуальна кожная падтэма абазначана габеленамі, якія колеравым вырашэннем і семантычна звязаны з пэўным сезонам і святам народнага календара [19, с. 94]. Другая зала музея прысвечана тэхнікам і відам ткацтва. Тут галоўным чынам прадстаўлены вырабы з лёну, узоры народных строяў, ільняныя рэчы ў інтэр’еры сялянскай хаты. Апошняя зала музея раскрывае глыбокі сэнс узораў арнаменту, якія змешчаны на тканых вырабах. Адна з задач гэтай залы – “падкрэсліць музейнымі прадметамі традыцыйную сямейную каляндарную абраднасць і характэрныя рысы арнаментыкі і семантыкі ў ткацтве, тыповыя для Паўночнай Беларусі” [29, с. 130]. У асобных вітрынах згрупаваны рэчы (галоўным чынам ручнікі), на якіх адлюстраваны ўзоры адной тэматыкі (ураджаю, дабрабыту, святаў і інш.). У сваю чаргу мадэль ткацкага рамяства прадстаўлена інсталяцыяй “Сусветнае дрэва”, якая сэнсава злучае залы музея, што знаходзяцца на розных узроўнях.

Якасная прэзентацыя элементаў НКС у экспазіцыі дапаўняецца актыўнай *выставачнай дзейнасцю,* прысвечанай нематэрыяльнай спадчыне. У апошнія гады праходзілі выставы, прысвечаныя традыцыйнаму беларускаму вяселлю (2009 і 2012 гг.), традыцыйнаму народнаму строю (2011 г.), музычным інструментам (2013 г.), асвятленню жылля (2013 г.), ткацтву (2014 г.), батлейцы (2015 г.), саломапляценню і вышыўцы (2016 г.), беларускай народнай лялцы (2016 г.).

Традыцыі правядзення беларускага вяселля былі адлюстраваны на выставе пад назвай “Вяселле: традыцыі і сучаснасць”, якая праходзіла з 14 кастрычніка па 31 студзеня 2009 г. і была арганізавана сумесна з РМГА “Студэнцкае этнаграфічнае таварыства”. Адкрыццё суправаджалася выступленнем фальклорных гуртоў, частаваннем караваем, традыцыйнымі беларускімі гульнямі і танцамі [30]. Да гэтай жа тэмы музей звяртаўся ў 2012 г., калі з 3 мая па 14 чэрвеня праходзіла выстава “Як вілася свадзебка хмелем каля двара…” (з фондавай калекцыі Лепельскага дома рамёстваў). Наведвальнікі маглі азнаёміцца з рэканструкцыяй святочных і вясельных строяў беларусаў [31, с. 40].

Беларускаму традыцыйнаму строю была прысвечана выстава “Народны касцюм Заходняй Віцебшчыны” [32], якая праходзіла з 14 мая па 30 жніўня 2011 г.

Выстава “Інструмент народны, і вясёлы, і журботны...”, прысвечаная народным музычным інструментам і беларускай музычнай традыцыі, праходзіла ў маі – жніўні 2013 г. і была падрыхтавана супрацоўнікамі НПГКМЗ сумесна з Браслаўскім раённым аб’яднаннем музеяў, Наваполацкім дзяржаўным му-

зычным каледжам і Полацкай дзіцячай школай мастацтваў. Экспанаваліся разнастайныя музычныя інструменты, але адметна тое, што наведвальнікі выставы мелі магчымасць пайграць на некаторых з іх, паўдзельнічаць у майстар-класе па вырабе музычнага інструмента [33].

Асаблівасцям асвятлення памяшканняў у XX ст. была прысвечана выстава "Пад лямпы дзіўнае святло...", што праходзіла ў снежні 2013 – студзені 2014 гг. Дэманстраваліся асвятляльныя прыборы і калекцыя выцінанак пад назвай "Па сцяжынках народнага календара", якая знаёміла наведвальнікаў з гадавым цыклам святаў народнага календара [34].

З 18 мая па 30 чэрвеня 2014 г. у Музеі традыцыйнага ручнога ткацтва Паазер'я праходзіла выстава "Пяшчота матчыных рук". На выставе былі прадстаўлены працы сучасных майстроў, ручнікі з фондаў Цэнтра рамёстваў і нацыянальных культур г. Полацка, Музея нацыянальных культур "Вытокі" Наваполацкага дзяржаўнага прафесійнага ліцэя будаўнікоў [35].

У калядны перыяд 2015/2016 гг. у музеі праходзіла выстава пад назвай "Таямніцы батлеечнай скрыні", на якой былі прадстаўлены калекцыя батлеечных лялек, батлеечныя скрыні Народнага тэатра лялек "КапялюШ" Цэнтра рамёстваў і традыцыйнай культуры г. Наваполацка [36]. Адметнасцю выставы з'яўляецца тое, што падчас яе правядзення адбылася святочная імпрэза "Батлейка-батлея – чароўная дзея!", якая праходзіла ў выглядзе сустрэчы з кіраўніком Народнага тэатра лялек і паказам батлеечнага спектакля.

З 22 лютага па 30 красавіка 2016 г. у музеі прайшла выстава пад назвай "Свет жаночага майстэрства", на якой былі прадстаўлены наступныя віды дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва: саломапляценне, аплікацыя з саломкі, вышыўка. Выстава арганізоўвалася сумесна з удзельнікамі Народнага клуба "Майстар" Полацкага раённага цэнтра рамёстваў і нацыянальных культур [37].

З 18 мая па 30 ліпеня 2016 г. праходзіла выстава "Лялька: абярог, гульня, памяць". Была прадстаўлена калекцыя лялек клуба фальклорнай і народнай лялькі "Папараць-кветка", што дзейнічае пры Беларускім нацыянальным тэхналагічным універсітэце [38]. Традыцыйны беларускі строй і міфалогія былі адлюстраваны праз дзіцячую і абрадавую ляльку.

Папулярызацыі і захаванню нематэрыяльнай спадчыны садзейнічае шырокі спектр *формаў культурна-адукацыйнай дзейнасці* Музея традыцыйнага ручнога ткацтва Паазер'я. Гэта экскурсіі (у тым ліку і тэматычныя), лекцыі, музейна-педагагічныя заняткі, майстар-класы, музейныя святы і тэматычныя праграмы-анімацыі. Ніжэй разгледзім найбольш удалыя прыклады выкарыстання розных форм культурна-адукацыйнай дзейнасці музея, звязанай з НКС.

Тэматыка НКС уключана ў аглядную экскурсію па музеі, што абумоўлена экспазіцыяй музея, прынцыпамі і метадамі яе пабудовы. У той жа час звычайную экскурсію можа зрабіць больш цікавай для наведвальнікаў уключэннем у яе дадатковай інфармацыі аб НКС. Так, у снежні 2011 – студзені 2012 гг. музей прапаноўваў сямейную экскурсію пад назвай "Вячоркі-супрадкі", якая суправаджалася майстар-класам па выцінанцы.

Больш грунтоўна з нематэрыяльнай спадчынай магчыма пазнаёміцца на музейнай лекцыі. Лекцыі ў Музеі традыцыйнага ручнога ткацтва Паазер'я вельмі часта дапаўняюць сустрэчы з носьбітамі НКС, даследчыкамі ў гэтай галіне, народнымі калектывамі. Шмат лекцыйных мерапрыемстваў праходзіць у межах дзейнасці так званага клуба выхаднога дня (шэраг мерапрыемстваў, скіраваных на забеспячэнне баўлення вольнага часу ў межах музейнай установы). Клуб выхаднога дня прапануе разнастайныя сустрэчы, на якіх разглядаюцца тэмы, прысвечаныя традыцыйнай культуры. Так, у жніўні-верасні 2013 г. прайшлі сустрэчы-лекцыі па наступных тэмах: "Інструмент народны, і вясёлы, і журботны..." (суправаджалася ігрой на дудзе і майстар-класам па народных танцах), "Лялькі з куфэрка бабкі Агапкі" (суправаджалася майстар-класам па стварэнні лялькі-скруткі), "Беларуская вышыванка" (майстар-клас па вышыўцы), "Беларускі пояс – зручны і прыгожы" (майстар-клас па пляценні пояса) [39].

У верасні 2013 г. была прачытана лекцыя загадчыка філіяла Веткаўскага музея народнай творчасці імя Ф.Р. Шклярава ў Гомелі П.М. Цалкі. Тэма – "Ткацтва як стварэнне свету і лёсу. Семантыка тэхналогіі і кампазіцыі рэчы, як мадэль культурнай прасторы". Асаблівасць сустрэчы ў тым, што мерапрыемства завяршылася майстар-класам па ткацтве [40].

У красавіку 2014 г. адбылося дзве лекцыі. Адна – з удзелам выкладчыкаў Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта пад назвай "Традыцыі беларускага вяселля" праходзіла ў выглядзе лекцыі-размовы, што раскрыла розныя аспекты падрыхтоўкі і правядзення традыцыйнага беларускага вяселля [41]. Другая лекцыя пад назвай "Ткацтва як цэлы свет" была прачытана кандыдатам мастацтвазнаўства, спецыялістам па традыцыйнай культуры, даследчыкам народнага тэкстылю В.А. Лабачэўскай. Падчас мерапрыемства адбылася прэзентацыя кнігі "Белорусский народный текстиль: художественные основы, взаимосвязи, новации".

Тэматыка лекцый разнастайная і закранае розныя бакі традыцыйнай культуры і НКС. 31 мая 2014 г. адбылася сустрэча "Зоркі жывуць у арнаменце". На сустрэчы супрацоўнік НАН Рэспублікі Беларусь Ц.В. Авілін прачытаў лекцыю, прысвечаную беларускім народным назвам зорак і сузор'яў, іх адлюстра-

ванню і месцы ў традыцыйным беларускім арнаменце [42]. А 29 кастрычніка 2016 г. выкладчыкамі Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта была прачытана лекцыя пад назвай "Дзяды vs Хэлоўін: святкуй сваё!", прысвечаная гісторыі свята ўшанавання продкаў "Дзяды" [43]. 22 снежня гэтага ж года адбылася прэзентацыя "Каляднай батлейкі". Наведвальнікі мерапрыемства ўбачылі батлеечны спектакль "Цар Ірад", праслухалі лекцыю аб паходжанні батлейкі і традыцыйных сюжэтах батлеечных спектакляў [44].

Супрацоўнікамі Музея традыцыйнага ручнога ткацтва Паазер'я распрацаваны і музейна-педагагічныя заняткі. Адзін з іх пад назвай "Калядная батлейка" прадугледжвае знаёмства з гісторыяй батлейкі і гісторыяй свята "Каляды" [45], а таксама спалучаецца з праглядам батлеечнага спектакля.

Майстар-клас, як было паказана вышэй, у якасці способа дэманстрацыі элементаў НКС часцей за ўсё спалучаецца з іншымі формамі культурна-адукацыйнай дзейнасці, але можа выкарыстоўвацца самастойна. У розныя гады ў музеі арганізоўваліся майстар-класы па ўпрыгожванню велікодных яек, вышыўцы, ткацтве, саломапляценні і інш. Майстар-класы праходзяць з удзелам носьбітаў НКС, якія ў межах музейнай установы дзеляцца сваімі ўменнямі і майстэрствам. У кастрычніку 2014 г. адбыўся майстар-клас па дэкаратыўна-прыкладным мастацтве пад назвай "А нітачка цуд стварае" з удзелам майстрыцы з в. Захарнічы Полацкага раёна Святланы Іванаўны Пугачовай [46]. У маі таго ж году ў Музеі традыцыйнага ручнога ткацтва Паазер'я была арганізавана творчая сустрэча з носьбітам НКС, народным майстрам па ткацтве Р.І. Язерскас [35, с. 38]. А таксама прайшло музейнае мерапрыемства (у выглядзе майстар-класу) "Сяўба лёну" [35, с. 43]. Класічная музейная экскурсія дапоўнілася майстар-класам для школьнікаў па пасеве лёну.

Найбольш масавыя мерапрыемствы, падчас якіх папулярызуецца і актуалізуецца НКС, – музейныя святы. Яны праходзяць альбо ў выглядзе сустрэч-вечарын, або спалучаюцца з асноўнымі святамі народнага календара.

Да прыкладу, 18 мая 2013 г. у музеі праходзіла дударская сустрэча-вечарына "Зайграй, зайграй, дудар!". Магчыма было пачуць народныя спевы ў выкананні гурта "Варган", дударскую музыку. Гурт дзейнічае з 2011 г. пры Полацкім дзяржаўным універсітэце і стала займаецца захаваннем і аднаўленнем аўтэнтычных беларускіх абрадаў, танцаў, спеваў. Сумесна з супрацоўнікамі музея "Варган" удзельнічаў у правядзенні такіх святаў як Каляды, Гуканне вясны і Купалле [47].

17 студзеня 2015 г. прайшла сустрэча-вечарына "З кім век векаваць?", на якой сумесна з гуртом архаічных спеваў "Княжыч" удзельнікі правялі калядныя варожбы. А вось у маі 2016 г. музейныя супрацоўнікі арганізавалі сустрэчу-вечарыну пад назвай "Як у хаце пры лучыне дзеўкі грошы палічылі...". Мэта мерапрыемства – знаёмства са стаўленнем да грошай у беларускім традыцыйным грамадстве. Для максімальна поўнага раскрыцця тэмы былі выкарыстаны розныя элементы НКС (прыказкі, прымаўкі, замовы і варажба, прыпеўкі, гульні) [48].

Музейныя святы, якія спалучаюцца з народным календаром, ператварыліся ў сталую практыку і карыстаюцца найбольшым попытам сярод наведвальнікаў. Галоўным чынам гэта музейныя святы "Ехала Каляда з Полацку" і "Гуканне вясны". У розныя гады праводзіліся таксама святы пад назвай "Мясаедная вяселіца", "Купалле", "Пакроўскі кірмаш" і інш.

Фальклорнае свята "Ехала Каляда з Полацка…" ладзіцца ў музеі штогод, як правіла, мерапрыемства ажыццяўляецца сумесна са студэнцкім фальклорным гуртом "Варган" [31, с. 46]. НКС тут прадстаўлена спевамі, святочнымі пажаданнямі, традыцыйнымі каляднымі гульнямі, варажбой і інш. У апошнія гады ўсё гэта дапаўняецца батлеечным спектаклем "Цар Ірад".

Своеасаблівай традыцыяй стала правядзенне ў сакавіку кожнага года свята "Гуканне вясны" (сумесна са студэнцкім фальклорным гуртом "Варган" [49]). Традыцыйныя гульні і карагоды падчас свята дапаўняюцца магчымасцю для наведвальнікаў музея паўдзельнічаць у майстар-класе па вырабе "веснавых птушак".

У кастрычніку 2012 г. у Музеі традыцыйнага ручнога ткацтва Паазер'я прайшло фальклорнае свята "Пакроўскі кірмаш", якое было арганізавана музеем сумесна з дзіцячым фальклорным калектывам "Лецейка". Пры правядзенні мерапрыемства выкарыстоўваліся ўзоры мясцовага фальклору і традыцыйнай культуры харчавання.

Тэматычныя праграмы-анімацыі з'яўляюцца спецыфічнай формай прэзентацыі НКС і, як правіла, праводзяцца непасрэдна па замове. З 2007 г. музей прапануе жадаючым стаць удзельнікамі вясельнага абраду пад назвай "Як зліліся дзве рэчанькі" [50]. Супрацоўнікі Музея традыцыйнага ручнога ткацтва Паазер'я выкарысталі пры распрацоўцы тэматычнай праграмы-анімацыі элементы НКС на навуковай аснове. Былі выкарыстаны не толькі спецыяльныя даследаванні, але і этнаграфічны матэрыял рэгіёну (у прыватнасці, запісы старшага навуковага супрацоўніка Г.А. Шарох) [31, с. 233]. Абрад "Як зліліся дзве рэчанькі" не з'ўляецца дэтальнай і дакладнай рэканструкцыяй вясельнага абраду, але дэманструе такія яго элементы, як адорванне, абыход, закладанне "рагаткі", традыцыйныя гульні. У той жа час характэрныя элементы абраду адаптаваныя да музейнай прасторы: абыходзяць не стол, а інсталяцыю "Сусветнае дрэва", адорваюць не традыцыйнымі падарункамі, а сучаснымі вырабамі і ў жартаўлівай форме. Адапта-

цыя да ўмоў музея змяняе элемент НКС, але ў той жа час дазваляе яго актуалізаваць, упісаць у сучасную традыцыю правядзення вяселля.

***Прыродна-экалагічны музей.*** На першы погляд можа падацца, што музеі прыродазнаўчага профіля найменшым чынам звязаны з НКС і не выкарыстоўваюць гэту спадчыну ў сваёй дзейнасці. Прыклад Прыродна-экалагічнага музея абвяргае гэту думку. У навуковай канцэпцыі музея адзначаецца, што "Музей прыроды ствараецца з мэтай знаёмства наведвальнікаў з асаблівасцямі мясцовай прыроды і яе багаццямі, характарыстыкай прыроды ў якасці геаграфічнага асяроддзя, у якім разгортваецца вытворчая дзейнасць людзей, што змяняе і пераўтварае прыроду" [51, с. 15]. Адлюстроўваючы вытворчую дзейнасць, якая пераўтварае прыроду, супрацоўнікі музея змаглі ўдала выкарыстаць элементы НКС, а ў прыватнасці традыцыйныя рамёствы. Так, на выставе "Прырода ў руках майстроў" (працы навучэнцаў Тэхналагічнага каледжа г. Віцебска) [31, с. 34], якая праходзіла з 8 лютага па 24 сакавіка 2012 г., акрамя мастацкіх прац з прыродных матэрыялаў, былі прадстаўлены традыцыйныя вырабы беларускіх рамёстваў (з гліны, лазы, ільну).

Супрацоўнікі музея змаглі выкарыстаць і, здавалася б, рэдкую ў музейнай інтэрпрэтацыі НКС такую яе вобласць, як вусныя традыцыі і формы выражэння, у прыватнасці казкі. У 2014 г. з 8 студзеня па 5 лютага ў Прыродна экалагічным музеі праходзіла выстава "Жывёлы з зімовых казак". Выстава давала магчымасць азнаёміцца з прыродным абліччам персанажаў зімовых казак, у тым ліку і беларускіх народных. Для поўнага раскрыцця тэмы на выставе былі прадстаўлены і прадметы побыту, якія фігуруюць у тэкстах казак, але не сустракаюцца ў сучасных інтэр'ерах [35, с. 31].

Выкарыстанне элементаў НКС Прыродна-экалагічным музеем не абмяжоўваецца дэманстрацыяй музейных прадметаў, звязаных з гэтай спадчынай, але ўключае і актыўныя формы прадстаўлення. Так, да Міжнароднага дня музеяў 18 мая 2014 г. Прыродна-экалагічны музей арганізаваў майстар-клас па саломапляценні, які правяла Л.М. Шайтар, майстар Полацкага раённага Цэнтра рамёстваў і нацыянальных культур. Майстар-клас праходзіў у выставачнай зале, дзе ў той час дэманстравалася выстава "Залатое пляценне" [35, с. 38]. Як бачна, музеі прыродазнаўчага профіля здольны выкарыстоўваць элементы НКС у экспазіцыйна-выставачнай і культурна-адукацыйнай дзейнасці.

У ***Краязнаўчым музеі*** ў экспазіцыі раздзел, прысвечаны традыцыйнай культуры, займае асобнае месца ў выглядзе рэканструкцыі інтэр'ера сялянскай хаты з сенцамі. Гэта тэматычная частка экспазіцыі носіць назву "Сялянскі побыт" і дэманструе прадметы пач. XX стагоддзя [2, с. 48]. Экспануюцца посцілкі, ручнікі, адзенне, керамічныя, саламяныя вырабы. На базе музея праходзяць музейна-педагагічныя заняткі, якія знаёмяць з НКС (напрыклад, занятак "Паўгадзіны ў сялянскай хаце") [52].

***Дзіцячы музей***, адчынены ў 2004 г., выкарыстоўвае ў сваёй культурна-адукацыйнай дзейнасці элементы НКС, хаця і ў нязначнай ступені. У кастрычніку 2014 г. на базе музея прайшло мерапрыемства пад назвай "Казкі з музейнага куфра", падчас якога ў гульнявой форме школьнікі знаёміліся з сюжэтамі беларускіх народных казак і казак народаў свету. Расказ дапаўняўся прадметамі, што ўзгадваюцца ў казках і гульнямі [35, с. 42]. З традыцыйнымі беларускімі гульнямі наведвальнікі Дзіцячага музея маглі пазнаёміцца, наведаўшы яго летам таго ж года. Удзельнікі музейна-педагагічнага занятка маглі даведацца аб гісторыі баўлення вольнага часу і паўдзельнічаць у гульнях "Дзеці", "Пацяг", "Адгадай назвы ягад і зёлак", "Хлебныя словы", "Мы збіраем садавіну" і інш. [53].

Падчас навуковай канферэнцыі "Культура Беларусі: рэаліі сучаснасці" на круглым стале "Кіраўнічыя практыкі і маркетынгавыя камунікацыі ў музейнай дзейнасці" дырэктарам НПГКМЗ Т. А. Джумантаевай была выказана ідэя стварэння ў будучым шэрагу іншых музеяў (старога горада, зброі, археалогіі, ганзейскага гандлю, знакамітых палачан, літаратуры, народнай медыцыны) [3, с. 386]. Стварэнне новых музеяў у будучым (асабліва музея народнай медыцыны) дазволіць яшчэ больш пашырыць выкарыстанне НПГКМЗ элементаў НКС у сваёй дзейнасці.

**Заключэнне.** На падставе прааналізаванага матэрыялу неабходна адзначыць, што ў НПГКМЗ у разглядаемы перыяд актыўна і паслядоўна займаліся вывучэннем НКС. Галоўныя накірункі навукова-даследчай работы музея-запаведніка, звязаныя з НКС, – гэта вывучэнне этнаграфічных калекцый і экспедыцыйная дзейнасць. Найбольшая ўвага музейнымі спецыялістамі надавалася вывучэнню калекцый, звязаных з традыцыйнымі рамёствамі, – ткацтвам, ганчарствам, салома- і лозапляценнем.

Максімальна эфектыўна і якасна ў экспазіцыйна-выставачнай і культурна-адукацыйнай дзейнасці НКС выкарыстоўвалася ў Музеі традыцыйнага ручнога ткацтва Паазер'я. У музеі прадстаўлены і выкарыстоўваюцца амаль ўсе вобласці НКС: вусныя традыцыі і формы выражэння (прыказкі, прыкметы, забабоны, варожбы), выканальніцкія мастацтвы (гурт "Варган", які выконвае падчас музейных святаў аўтэнтычныя спевы Падзвіння), традыцыйныя цырымоніі (музейнае свята "Ехала Каляда з Полацку", тэматычная праграма-анімацыя "Як зліліся дзве рэчанькі"), светапогляд людзей і міфалогія (намаганне раскрыць у экспазіцыі і агляднай экскурсіі семантыку ўзораў арнамента, язычніцкія вобразы), традыцыйныя рамёствы (ткацтва і цыкл апрацоўкі лёну).

Выставачная дзейнасць Музея традыцыйнага ручнога ткацтва Паазер'я, якая адлюстроўвае НКС рэгіёна, сведчыць аб магчымасцях музейных устаноў шырока выкарыстоўваць элементы НКС у сваёй дзейнасці. Выставы музея знаёмяць не толькі з элементамі НКС, якія звязаны з апрацоўкай лёну і ткацтвам, але ахопліваюць розныя бакі традыцыйнай культуры рэгіёна. Адкрыццё выстаў часта суправаджаецца майстар-класамі, якія дазваляюць наведвальнікам засвоіць элементы НКС і стаць, у пэўнай ступені, іх носьбітамі. А гэта, у сваю чаргу, спрыяе захаванню НКС.

Захаванню і папулярызацыі нематэрыяльнай спадчыны спрыяюць разнастайныя формы культурна-адукацыйнай дзейнасці музея, у якіх выкарыстоўваюцца элементы НКС, – экскурсіі (у тым ліку і тэматычныя), лекцыі, музейна-педагагічныя заняткі, майстар-класы, музейныя святы і тэматычныя праграмы-анімацыі.

Прыклад НПГКМЗ (Прыродна-экалагічны музей) сведчыць аб тым, што ў сваёй дзейнасці НКС могуць выкарыстоўваць не толькі музеі этнаграфічнага профілю або комплексныя музеі, але нават і прыродазнаўчыя.

Актыўнае выкарыстанне музеем нематэрыяльнай спадчыны спрыяе актуалізацыі гэтай спадчыны ў сучасным грамадстве, а значыць і яе далейшаму захаванню. Элементы НКС, удала і на навуковай аснове ўжытыя ў музейнай дзейнасці, робяць формы культурна-адукацыйнай дзейнасці ўстановы больш разнастайнымі і прыцягальнымі для наведвальнікаў, аглядную экскурсію па музеі – інтэрактыўнай, узаемадзеянне з музейнай аўдыторыяй – больш эфектыўным. Актуалізацыя элементаў НКС дае магчымасць фарміраваць на іх падставе нацыянальна-культурную ідэнтычнасць, пачуццё патрыятызму і культурнай адметнасці ўласнага рэгіёну (асабліва ў малодшых наведвальнікаў музея).

ЛІТАРАТУРА


1. Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры : прыняты Палатай прадстаўнікоў 24 чэрв. 2016 г.: адобраны Саветам Рэспублікі 30 чэрв. 2016 г. : уступае ў сілу з 3 лютага 2017 г. – Мінск : Нацыянальны цэнтр прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь, 2016. – 270 с.
2. Музеі Полацка = Музеи Полоцка = Polotsk museums : фотаальбом / аўтар тэксту і ўклад. Т.А. Джумантаева ; пер. на англ. мову: Н.А. Далжонак ; фота: І.У. Супранёнак. – Мінск : Беларусь, 2015. – 332 с.
3. Джумантаева, Т.А. Стратэгія захавання культурнай спадчыны Полацка як фактар устойлівага развіцця музея-запаведніка / Т.А. Джумантаева // Культура Беларусі: рэаліі сучаснасці : матэрыялы Міжнароднай навук.-практ. канф., Мінск, 12 – 13 чэрв. 2012 г. / уклад.: А.А. Галкін, І.Р. Голубева ; рэдкал.: І.І. Крук (гал. рэд.), А.А. Галкін, І.Р. Голубева. – Мінск : Ін-т культуры Беларусі, 2012. – С. 384–391.
4. Джамунтаева, Т.А. Музеяграфічны агляд з нагоды 30-годдзя самастойнасці Полацкага музея-запаведніка / Т.А. Джамунтаева // Искусство и культура : науч.-практич. журнал. – Витебск, 2015. – № 4. – С. 75-81.
5. Палажэнне аб навукова-даследчай дзейнасці НПГКМЗ // Навуковы архіў НПГКМЗ. – Л. 3.
6. Ласточкина, Л.В. Отчет о работе историко-бытовой экспедиции на территории Поставского района / Л.В. Ласточкина // Навуковы архіў НПГКМЗ. – Л. 5.
7. Список экспонатов, приобретённых экспедицией Полоцкого историко-культурного заповедника в населённых пунктах Поставского района Витебской области // Навуковы архіў НПГКМЗ. – Л. 4.
8. Ласточкина, Л.В. Отчет о работе историко-этнографической экспедиции на территории Островщинского сельсовета Полоцкого района / Л.В. Ласточкина // Навуковы архіў НПГКМЗ. – 7 л. (л2)
9. Список экспонатов, приобретённых экспедицией Полоцкого историко-культурного заповедника в населённых пунктах Верхнедвинского района Витебской области // Навуковы архіў НПГКМЗ. – Л. 4.
10. Text of the Convention for the Safeguarding of the Intangible Cultural Heritage [Electronic resource] // Official website of The United Nations Educational, Scientific and Cultural Organization. – Mode of access: http://www.unesco.org/culture/ich/index.php?lg=en&pg=00006. – Date of access: 10.10.2014.
11. Краско, О.Д. Гончарство Витебщины I пол. XX в. / О.Д. Краско // Тэзісы дакладаў навуковых супрацоўнікаў ПГКЗ па выніках працы навук.-практыч. канф. 1989, 1990 г. – Полацк : ПГКЗ, 1991. – С. 6–7.
12. Лугина, Н.Г. Народное ткачество Витебщины (советский период) / Н.Г. Лугина // Тэзісы дакладаў навуковых супрацоўнікаў ПГКЗ па выніках працы навук.-практыч. канф. 1989, 1990 г. – Полацк : ПГКЗ, 1991. – С. 8–9.
13. Пелых, В.А. Изделия из соломы и лозы в фондах ПИКЗ / В.А. Пелых // Тэзісы дакладаў навуковых супрацоўнікаў ПГКЗ па выніках працы навук.-практыч. канф. 1991, 1992 г. – Полацк : ПГКЗ, 1993. – С. 22–23.
14. Ушакова, Е.А. Коллекция поддужных колокольчиков в фондах НПИКМЗ / Е.А. Ушакова // Матэрыялы навук.-практыч. канф. : па выніках навук.-даследч. работы ў 2005 г. / уклад. Т.А. Джумантаева – Полацк : НПГКМЗ, 2006. – С. 136–142.
15. Посадская, Ж.В. Архитектурный декор традиционного дома – источник изучения народной художественной традиции / Ж.В. Посадская // Тэзісы дакладаў навуковых супрацоўнікаў ПГКЗ па выніках працы навук.-практыч. канф. 1991, 1992 г. – Полацк : ПГКЗ, 1993. – С. 4–5.
16. Пасадская, Ж.У. Адлюстраванне паганскага светапогляду ў арнаментальных кампазіцыях дэкора традыцыйных дамоў Полацка і яго наваколля / Ж.У. Пасадская // Тэзісы дакладаў навуковых супрацоўнікаў ПГКЗ па выніках працы навук.-практыч. канф. 1991, 1992 г. – Полацк : ПГКЗ, 1993. – С. 28–29.
17. Ушакова, Е.А. Коллекция белорусской народной керамики в фондах ПИКЗ. Каталог. Историография и библиография вопроса / Е.А. Ушакова // Тэзісы дакладаў навуковых супрацоўнікаў ПГКЗ па выніках працы навук.-практыч. канф. 1991, 1992 г. – Полацк : ПГКЗ, 1993. – С. 25.

18. Ушакова, Е.А. Коллекция изделий из лозы и соломы в фондах ПИКМЗ. Историография. Объём, состав, структура каталога / Е.А. Ушакова // Матэрыялы навук.-практыч. канф. па выніках навук.-даследч. работы ў 1997 г. / уклад. Т.А. Джумантаева. – Полацк : ПГКМЗ, 1998. – С. 75-82.
19. Філатава, Н.В. Вобразы язычніцкай міфалогіі (на аснове тэматычнай структуры I і II залаў Музея ткацтва) / Н.В. Філатава // Матэрыялы навук.-практыч. канф. па выніках навук.-даследч. работы ў 1997 г. / уклад. Т.А. Джумантаева. – Полацк : ПГКМЗ, 1998. – С. 93–96.
20. Ушакова, Е.А. Коллекция изделий из соломы и лозы / Е.А. Ушакова // Матэрыялы навук.-практыч. канф. па выніках навук.-даследч. работы ў 1999 г. / уклад. Т.А. Джумантаева. – Полацк : НПГКМЗ, 2000. – С. 56–61.
21. Філатава, Н.В. Тэматычны каталог калекцыі ручнікоў Полацкага раёна к. XIX – пач. XX стст. / Н.В. Філатава // Матэрыялы навук.-практыч. канф. па выніках навук.-даследч. работы ў 1999 г. / уклад. Т. А. Джумантаева. – Полацк : НПГКМЗ, 2000. – С. 62–71.
22. Філатава, Н.В. Асаблівасці развіцця жаночага касцюма на Паазер'і ў к. XIX – пач. XX ст. (канструктыўна-тэхналагічныя асаблівасці жаночага адзення Расонска-Верхнядзвінскага крою) / Н.В. Філатава // Матэрыялы навук.-практыч. канф. па выніках навук.-даследч. работы ў 2004 г. / уклад. Т.А. Джумантаева. – Полацк : НПГКМЗ, 2005. – С. 92–95.
23. Дамаскіна, В.Ф. Народнае адзенне ў звычаях і абрадах беларусаў (сямейная абрадавасць) / В.Ф. Дамаскіна // Матэрыялы навук.-практыч. канф. па выніках навук.-даследч. работы ў 2004 г. / уклад. Т.А. Джумантаева. – Полацк : НПГКМЗ, 2005. – С. 6–14.
24. Філатава, Н.В. Каталог ручнікоў з музейнага збору НПГКМЗ / Н.В. Філітава // Матэрыялы навук.-практыч. канф. па выніках навук.-даследч. работы ў 2006 г. / уклад. Т.А. Джумантаева. – Полацк : НПГКМЗ, 2007. – С. 160–162.
25. Пракоф'ева, Ю.С. Абрусы з музейнага збору НПГКМЗ: уступны артыкул да тэматычнага каталога / Ю.С. Пракоф'ева // Матэрыялы навук.-практыч. канф. па выніках навук.-даследч. работы ў 2008 г. / уклад. Т.А. Джумантаева. – Полацк : НПГКМЗ, 2009. – С. 196–207.
26. Шарох, Г.А. Элементы традыцыйнага вяселля на Падзвінні ў вясельным абрадзе Музея ткацтва «Як зліліся дзве рэчанькі…» / Г.А. Шарох // Полацкі музейны штогоднік : зб. навук. арт. за 2013 г. / уклад. Т.У. Явіч. – Полацк : НПГКМЗ, 2014. – С. 231–239.
27. Філатава, Н.В. Мастацка-тэхналагічныя асаблівасці ўзорнага ткацтва ручнікоў з музейнага збору НПГКМЗ / Н.В. Філатава / Полацкі музейны штогоднік : зб. навук. арт. за 2013 г. / уклад. Т.У. Явіч. – Полацк : НПГКМЗ, 2014. – С. 213–222.
28. Філатава, Н.В. Навуковая канцэпцыя і тэматычная структура музея традыцыйнага ручнога ткацтва / Н.В. Філатава // Тэзісы дакладаў навук. супрацоўнікаў ПГКЗ па выніках працы ў 1993–1994 гг. навук.-практыч. канф. 1994 г. – Полацк : ПГКЗ, 1994. – С. 35–36.
29. Філатава, Н.В. Прэзентацыя музейных калекцый у экспазіцыі музея традыцыйнага ручнога ткацтва Паазер'я / Н.В. Філатава // Першы нац. форум "Музеі Беларусі", Гродна, 12–14 кастр. 2012 г. = The first national forum "Museums of Belarus", Grodno, 12–14 oct. 2012. – Гродна, 2012. – С. 129–135.
30. Выстава «Вяселле: традыцыі і сучаснасць» [Электронны рэсурс] // Афіцыйны сайт Музея традыцыйнага ручнога ткацтва Паазер'я. – Рэжым доступу: http://tkach.polotsk.museum.by/be/node/5373. – Дата доступу: 03.02.2017.
31. Полацкі музейны штогоднік : зб. навук. арт. за 2013 г. / уклад. Т.У. Явіч. – Полацк : НПГКМЗ, 2014. – 288 с.
32. Выстаўка "Народны касцюм Заходняй Віцебшчыны" [Электронны рэсурс] // Афіцыйны сайт Музея традыцыйнага ручнога ткацтва Паазер'я. – Рэжым доступу: http://tkach.polotsk.museum.by/be/node/21975. – Дата доступу: 03.02.2017.
33. "Інструмент народны, і вясёлы, і журботны..." [Электронны рэсурс] // Афіцыйны сайт Музея традыцыйнага ручнога ткацтва Паазер'я. – Рэжым доступу : http://tkach.polotsk.museum.by/be/node/33711. – Дата доступу : 03.02.2017.
34. Выстаўка "Пад лямпы дзіўнае святло..." [Электронны рэсурс] // Афіцыйны сайт Музея традыцыйнага ручнога ткацтва Паазер'я. – Рэжым доступу: http://tkach.polotsk.museum.by/be/node/34776. – Дата доступу: 03.02.2017.
35. Полацкі музейны штогоднік : зб. навук. арт. за 2014 г. / уклад. Т.У. Явіч. – Полацк : НПГКМЗ, 2015. – 312 с.
36. Выстаўка "Таямніцы батлеечнай скрыні" [Электронны рэсурс] // Афіцыйны сайт Музея традыцыйнага ручнога ткацтва Паазер'я. – Рэжым доступу: http://tkach.polotsk.museum.by/be/node/38533. – Дата доступу: 05.02.2017.
37. Выстаўка "Свет жаночага майстэрства" [Электронны рэсурс] // Афіцыйны сайт Музея традыцыйнага ручнога ткацтва Паазер'я. – Рэжым доступу: http://tkach.polotsk.museum.by/be/node/38941. – Дата доступу: 05.02.2017.
38. Выстаўка "Лялька: абярог, гульня, памяць" [Электронны рэсурс] // Афіцыйны сайт Музея традыцыйнага ручнога ткацтва Паазер'я. – Рэжым доступу: http://tkach.polotsk.museum.by/be/node/39538. – Дата доступу: 05.02.2017.
39. Сямейны адпачынак у музеі [Электронны рэсурс] // Афіцыйны сайт Музея традыцыйнага ручнога ткацтва Паазер'я. – Рэжым доступу: http://tkach.polotsk.museum.by/be/node/34146. – Дата доступу: 05.02.2017.
40. Лекцыя - майстар-клас Пятра Цалкі [Электронны рэсурс] // Афіцыйны сайт Музея традыцыйнага ручнога ткацтва Паазер'я. – Рэжым доступу: http://tkach.polotsk.museum.by/be/node/34324. – Дата доступу: 06.02.2017.
41. Сустрэча "Традыцыі беларускага вяселля" [Электронны рэсурс] // Афіцыйны сайт Музея традыцыйнага ручнога ткацтва Паазер'я. – Рэжым доступу: http://tkach.polotsk.museum.by/be/node/35251. – Дата доступу: 06.02.2017.
42. Сустрэча "Зоркі жывуць у арнаменце" [Электронны рэсурс] // Афіцыйны сайт Музея традыцыйнага ручнога ткацтва Паазер'я. – Рэжым доступу: http://tkach.polotsk.museum.by/be/node/35543. – Дата доступу: 06.02.2017.
43. Дзяды vs Хэлоўін: святкуй сваё! [Электронны рэсурс] // Афіцыйны сайт Музея традыцыйнага ручнога ткацтва Паазер'я. – Рэжым доступу: http://tkach.polotsk.museum.by/be/node/40416. – Дата доступу: 12.02.2017.
44. Прэзентацыя "Калядная батлейка" [Электронны рэсурс] // Афіцыйны сайт Музея традыцыйнага ручнога ткацтва Паазер'я. – Рэжым доступу: http://tkach.polotsk.museum.by/node/40666. – Дата доступу: 12.02.2017.

45. Музейна-педагагічны занятак "Калядная батлейка" [Электронны рэсурс] // Афіцыйны сайт Музея традыцыйнага ручнога ткацтва Паазер'я. – Рэжым доступу: http://tkach.polotsk.museum.by/node/40708. – Дата доступу: 12.02.2017.
46. А нітачка цуд стварае... [Электронны рэсурс] // Афіцыйны сайт Музея традыцыйнага ручнога ткацтва Паазер'я. – Рэжым доступу: http://tkach.polotsk.museum.by/be/node/36098. – Дата доступу: 12.02.2017.
47. Фальклорны гурт «Варган» [Электронны рэсурс] // Афіцыйны сайт Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта. – Рэжым доступу: http://elib.psu.by:8080/handle/123456789/13558. – Дата доступу: 14.02.2017.
48. Вечарына "Як у хаце пры лучыне дзеўкі грошы палічылі..." [Электронны рэсурс] // Афіцыйны сайт Музея традыцыйнага ручнога ткацтва Паазер'я. – Рэжым доступу: http://tkach.polotsk.museum.by/be/node/39477. – Дата доступу: 14.02.2017.
49. Заклічам вясну разам! [Электронны рэсурс] // Афіцыйны сайт Музея традыцыйнага ручнога ткацтва Паазер'я. – Рэжым доступу: http://tkach.polotsk.museum.by/be/node/39103. – Дата доступу: 14.02.2017.
50. Вясельны абрад «Як зліліся дзве рэчанькі...» [Электронны рэсурс] // Афіцыйны сайт Музея традыцыйнага ручнога ткацтва Паазер'я. – Рэжым доступу: http://tkach.polotsk.museum.by/be/node/18165. – Дата доступу: 16.02.2017.
51. Беспрозванная, Н. В. О концепции музея природы / Н. В. Беспрозванная // Тэзісы дакладаў навуковых супрацоўнікаў ПГКЗ па выніках працы навук.-практыч. канф. 1991, 1992 г. – Полацк : ПГКЗ, 1993. – С. 15.
52. "Музейный калейдоскоп" (программа для детей 5-и лет) [Электронны рэсурс] // Афіцыйны сайт Краязнаўчага музея. – Рэжым доступу: http://children.polotsk.museum.by/n-ode/34949. – Дата доступу: 16.02.2017.
53. У што гулялі дзеці 150 гадоў таму [Электронны рэсурс] // Афіцыйны сайт Дзіцячага музея. – Рэжым доступу: http://children.polotsk.museum.by/node/35613. – Дата доступу: 16.02.2017.

*Паступіў 20.01.2017*

## INTANGIBLE CULTURAL HERITAGE STUDIES AND FOREGROUNDING BY THE POLOTSK NATIONAL HISTORICAL AND CULTURAL MUSEUM RESERVE IN 1991–2016

***D. FILIPCHIK***

*The article covers the research of intangible cultural heritage elements used in expositional, cultural and educational activities of the Polotsk National historical and cultural museum reserve in 1991–2016. The main directions of the museum's intangible culture scientific research are put forward. The research comprises evidence and examples of the museum's cultural and educational activities which use the elements of intangible cultural heritage and foster its preservation and popularization (excursions, lectures, museum educational classes, master classes, museum holidays and thematic animated programmes). The article explaines the role of the Polotsk National historical and cultural museum reserve in intangible cultural heritage preserving and foregrounding.*

***Keywords**: intangible cultural heritage, Polotsk National Historical and Cultural Museum-Reserve, cultural and educational activities of the museum, Museum of Traditional Manual Weaving of Poozerye, preservation of heritage.*